Пасьля канфіскаты выданьне другое.

Голас Студэнта

АДНАДНЁЎКА.

Цана 10 гр. Вільня, 25 чэрвеня 1937 г. Адрыс Рэдакцыі: Вільня, Завальная 1—1.

Да ідэолёгіі сучаснага беларускага студэнцтва

Студэнцтва — гэта новая зьмена. Так ёсьць у кожным народзе і грамадзянстве, так ёсьць тымбольш у народзе і грамадзянстве беларускім. Кажам — тымбольш, бо калі маладое інтэлігентнае пакаленьне ў іншых, культурна далей і вышэй стаячых, народаў не абавязкава патрабуе інтэнсыўна брацца за ідэовую працу, дык беларуская і маладая інтэлігенцыя ёсьць сапраўды зьменай старой беларускай гвардыі дзеля далейшай працы на нацыянальнай ніве. Ад старэйшых на маладзейшых у спадчыне пераходзе ў нас абавязак далейшага разьвіцьця беларускага нацыянальнага руху. Гваранцыяй-жа таго, што гэта маладая беларуская інтэлігенцыя сапраўды будзе снуць далей сваю нацыянальную думку і для яе працаваць, зьяўляецца прысутнасьць у яе душы ідэолёгіі і — да таго — ідэолёгіі адпаведнай. Агулам чалавек без ідэолёгіі ў жыцьці мала або і ніякага ня мае значэньня, а тымбольш беларускі малады інтэлігент.

А што-ж гэта такое — ідэолёгія? Агулам кажучы, гэта ёсьць сталы, перадуманы сьветагляд чалавека, гэта яго лёгічна і этычна абаснаванае пракананьне, якое кіруе яго думкамі і дзейнасьцю. Але жыцьцё ёсьць бязбрэжна шырокае і рознароднае. Дзеля гэтага мала чалавеку мець нейкі агульна-жыцьцёвы сьветагляд, агульную ідэолёгію, але трэба яшчэ гэткую мець і ў розных паасобных праявах жыцьця, асабліва жыцьця практычнага, канкрэтнага. Для беларускага студэнта апрача агульна-жыцьцёвай ідэолёгіі патрэбная так-жа ідэолёгія агульна-беларуская, патрэбны агульны ідэовы плян і пагляд, паводле якога належыцца ацэньваць усе праявы беларускай нацыянальнай праблемы і паводле якога належыцца кіраваць усю сваю дзейнасьць на беларускай ніве. Вось-жа калі йдзецьаб гэтую нацыянальную ідэолёгію беларускага сучаснага студэнцтва, дык гэткай мае быць *дэмакрацыя*.

Слова дэмакрацыя паходзіць ад двух грэцкіх слоў: *дэмос* — народ і *кратіа* — ўлада, што даслоўна знача народаўладзтва, улада народу. Формы дэмакрацыі могуць быць розныя. Бывае дэмакрацыя беспасрэдная, калі народ сам на сваіх сабраньнях нешта пастанаўляе, як гэта бывала ў старадаўнай Беларусі на народных вечах, а такжа ў Афінах (Грэцыя) ў V ст. прад Хрыстом. Сяньня шырока ёсьць ведамай дэмакрацыя парлямэнтарная, калі народ кіруе сваім краем праз выбраных сабой прадстаўнікоў. Могуць такжа быць і іншыя формы дэмакрацыі. Словам, дэмакрацыя, агулам гаворачы, гэта такі палітычна-грамадзкі лад, дзе ўлада належа да народу і дзе інтарэсы народу ставяцца на першым месцы.

Сутнасьць дэмакрацыі становяць прадусім ідэі вольнасьці і роўнасьці. *Вольнасьць* — гэта прыродны інстынкт чалавека, які зьяўляецца выяўленьнем творчай потэнцыянальнай людзкой энэргіі і адначасна пратэстам на ўсякія грамадзкія перапыны гэтай энэргіі. Дэ-

макрацыя імкнецца да загварантаваньня чалавеку як найбольш вольнасьці, як асабістай (свабода слова, сумленьня, арганізацыі і таму пад.), а так-жа і вольнасьці палітычна-грамадзкай (вызваленьне прыгнечаных і эксплёатаваных клясаў і нацыянальнасьцяў).

Але вольнасьць лёгка можа вырадзіцца ў анархію, развал і бязладзьдзе і, замест дабрадзейства для чалавека, можа стацца для яго праклёнствам. Вось-жа, каб вольнасьць ня выраджілася ў анархію, запабягае *роўнасьць*, якая спыняе развыдранасьць вольнасьці і ставіць ей граніцы і змушае яе спыніцца там, дзе пачынаюцца правы другіх адзінак і другіх грамадзянстваў і народаў. Ужо з самай прыроды чалавека можна судзіць, што ў прынцыпе людзі між сабой роўныя і што дзеля гэтага чалавек над чалавекам панаваць не павінен. Жыцьцёвы аднак досьлед вучыць, што калі людзі сапраўды хочуць быць між сабой роўнымі, дык мусяць паддацца якой-небудзь уладзе. Але праз гэта дэмакрацыя яшчэ не адракаецца ад спалучэньня вольнасьці з роўнасьцяй. Іменна сынтэза гэтых двух прынцыпаў належа да сутнасьці дэмакрацыі. Роўнасьць звычайна разумеецца, як роўнасьць варункаў жыцьцёвых, якія людзям даюць аднолькавую магчымасьць жыць і разьвівацца.

Ужо з гэтых некулькі дужа агульных увагаў аб дэмакрацыі відаць, што яна ёсьць сапраўды вялікай ідэяй, якая нясе з сабой многа праўды і жыцьцёвай красы. Кідаецца гэта проста з непаканальнай сілай у вочы, асабліва сяньня, калі так страшэнна на сьвеце разнаглелі розныя сілы, што гвалтуюць самыя прыродныя і сьвятыя правы, як адзінак, так грамадзянстваў і цэлых народаў. Ужо з гэтага самага, кажам, відаць так-жа, якую грамадзка-палітычную ідэолёгію мае сабе выбраць, яе трымацца і паводле яе нормаў працаваць, сучасны беларускі студэнт, які часткова ўжо працуе на ніве роднай культуры і які незадоўга, як новая зьмена, будзе прымушаны ўзяць у свае рукі на сваю адказнасьць усю справу беларускага народу.

Але на заканчэньне хоць у некалькіх словах пастараймося сконкрэтызаваць усё тое, што змушае беларускага студэнта трымацца дэмакрацыі, у яе духу гадавацца і працаваць.

Народу трэба несьці *асьвету і веду* для яго патрэбную і даступную. У першую бадай чаргу павінен сяньня рабіць гэта беларускі студэнт усімі тымі спосабамі, якія для яго даступныя. А веду-ж

Фатаграфія Сямейнікавых

Стары Сямейнік — інтэлігент 80—90-тых гадоў мінулага стагодзьдзя. Тады ён лічыў сябе чыстакроўным расейцам. З уздымам беларускага адраджэнскага руху, як нярaз гаварыў „на всякий случай“ — дзеці былі беларусамі. Нярaз, як прыяджалі з Вільні, прывозілі яны з сабой беларускую прэсу. Праўда, бяз цэнзуры старога, прэса гэта не магла паказацца на вёсцы.

Стары ня мог спакойна глядзець на артыкулы аб сацыяльнай няроўнасьці, або на артыкулы, у якіх гаварылася аб абавязках інтэлігента беларуса.

Усё гэта ён замазваў спэцыяльна ім зробленай для цэнзуры нейкай рыжай няпрыемнай хварбай.

Квэстыю сацыяльную ён замазваў ня дзеля таго, што ня быў староньнікам аграрнай рэформы, і меў найбольш зямлі ў вёсцы, а проста фізычна ня мог перанасіць гэтага тэрміну,—яму тады нешта балела пад скабамі, торгала нешта. Наадварот, да праблемы сацыялізму, зразумела, гледзячы на гэта выключна з „свайго“ пункту гледжаньня, глядзеў аптымістычна. Будучы яшчэ вучням „рэальнага“ прапаведваў: сацыялізм сам прыйдзе... за гадоў сто... Праўда, з матэматыкі у „рэальным“ меў двойку і таму можа цяпер маючы гадоў 80 усё прыход сацыялізму адкладаў на тую самую „сотню.“

Праўда, стары на вёсцы ня меў ніякага ўплыву. Нярaз казаў Сьцяпан Каваль: з Сямейнікаў і гнаявымі віламі апрача патрухі нічога ня вытрасеш. Магчыма, што ён меў на ўвазе толькі старое пакаленьне Сямейнікаў.

— — — — — — — —

Гарачым чалавекам быў малады Сямейнік! Перш за праўду быў ён нат' гатоў галаву палажыць! З часам, як патанела праўда усё-ж-ткі ўмеў за яе пастаяць. І толькі з гадамі, як бліжэй пачаў дапаўзаць да дыплёму агранома, заўважылі ўсе, а тым-больш на вёсцы, што з маладым Сямейнікам штось робіцца нядобрае, альбо, — варажылі, — прыбліжаецца нейкая хвароба, ці пасада.

гэту свайму народу панясе толькі той студэнт, які добра разумее вялікія ідэі дэмакратызму і які ёсьць грунтоўна імі праняўшыся. Той, хто не разумее імкненьняў і патрэбаў вялізарнай большасьці свайго народу, да гэтага народу не падойдзе і нічога для дабра яго зрабіць ня зможа, астаючыся нікому непатрэбным паничом.

Трэба ўсьведамляць народ беларускі аб палітыцы, соцыялёгіі і эканоміцы. Трэба рабіць-жа гэта так, каб з гэтага ўсьведамленьня народу была сапраўдная карысьць, каб яно было адпаведным да беларускай нацыянальнай ідэолёгіі і адпаведнай да сапраўдных патрэб народу. І тут у першую чаргу пакліканы ёсьць беларускі студэнт, студэнт дэмакрат, які жыве жыцьцём свайго народу і які носе ў сваей душы вялікія дэмакратычныя ідэалы.

Трэба так-жа ўсьведамляць беларускі народ і нацыянальна, паказваючы яму на тое, як вялікім ёсьць фактарам культуры, дабрабыту і агулам поступу нацыянальная сьведамасьць і нацыянальнае жыцьцё кожнага народу. Трэба вучыць народ любіць сваё, але так-жа адначасна і шанаваць чужое. Загразнуць у сваім эгоістычным нацыяналізьме, карміцца атруваючымі міязматамі шовінізму, ненавісьцяй чужых нацыяў, ізалявацца ад чужых культур — ёсьць рэчай варожай і шкоднай для беларускага народу і для яго сапраўднага дабра. Адпаведна-ж асьвячаць беларускі народ у нацыянальнай галіне зможа толькі беларускі студэнт дэмакрат, які, маючы незакутую, але адкрытую галаву, шмат далей бача, чым яго ўласнае асяродзішча і дзеля гэтага тымбольш разумна і глыбока любіць свой народ і разумее яго нацыянальныя патрэбы.

Словам, будучыня беларускага народу залежа ад пранікання ў яго народныя гушчы несьмяротных, поўных лёгічнага і этычнага чару, дэмакратычных ідэяў, і ад таго, наскольки гэтым ідэям будзе верным і панясе іх у свой народ беларускае студэнцтва—заўтрашняя новая зьмена пры плузе на беларускай агульна-нацыянальнай ніве...

Многія матурысты (сткі) Беларусы ня могуць вучыцца ў вышэйшых школах, а з тых што ўступілі, многія ня могуць утрымацца,— бо ня маюць адпаведных матарыяльных варункаў. Заклікаем беларускае грамадзянства чула аднесьціся да справы дапамогі беларускай студэнцкай моладзі, прысылаючы на адрыс беларускіх часапісаў ахвяры, з зацемкай: „на фонд беларускай студэнцкай моладзі“.

Часамі прапаведваў: як падняць ураджайнасьць, якімі машынамі лепш урабляць зямлю, аж пакуль яму не парадзілі сяляне лепш расказваць гэта сэквэстратару і далей жылі па-своему, ня дзеля таго, што ня мелі за што купіць карысных машын (думаў так малады Сямейнік), а проста прывычаіліся жыць бяз хлеба і солі.

А ўжо калі пачалі некаторыя падаваць школьныя дэклярацыі на беларускую школу, ды ладзіць свае прадстаўленьні, агулам, вычуўшы носам непагоду, малады Сямейнік парваў усе зносіны з вёскай.

У паперах зьмяніў і „narodowość“ і „wyznanie,“ толькі засталася ў паперах адна вёска Гарыдаўка, у якой калісь праз непалітычную блізарукую палітыку бацькоў радзіўся.

Зьмяніў ён гэта ўсё лёгка, як і ўсе з радні Сямейнікавых рабілі гэта на працягу усей сваёй гісторыі, от, так, проста нібы налажыў заместа зношанага каўнерыка новы, у якім ня стыдна было злажыць візыту і гмінаму пісару, і войту, і нават самому пану камэнданту. **М. Т—к.**

Усходняя казка

(з прычыны адных перавыбараў)

— Аллах вялікі і справядлівы! — сказаў раз хітры і дурны Алі вітаючы раніцай свайго ўладара.

Паша Ахмэт сядзеў на саламянцы і думаў. Апошняй ноччу прысьніўся яму сон, што быццам ён раптам стаў таўсьцець, галава выцягнулася да залатых мінарэтаў Ая Сафія, бруха расло і расло аж затарасавала ўвесь Басфор; адна нага выцягнулася ледзь не да Запарожжа, другая—ледзь відаць быў канец пантофля на вяршынах германскіх Альпаў.

Алі даглядаў у свайго ўладара гарэм. А так, як у гарэме было шмат баб, якім вечна сьніліся сны, дык Алі як найбольш практычны ў мэтафізыцы пачаў расталкоўваць і сон Ахмэта.

— Будзеш, — казаў,—Паша, вялікім. Аж да дзікіх стэпаў і да Альп пойдзе твая слава. Гарэм твой павялічыцца новымі здабычамі. Яшчэ дзьве нагі і бруха, якое ты бачыў

Першае выданьне гэтай аднаднёўкі загадам Старасты м. Вільні сканфіскавана 26.VI.37 за артыкул: „Нацыянальная і сацыяльная праблема“.

у сьне, азначае, што Аллах апекаваўся табой праз тры вякі, а галава пераваліць аж на чацьверты.

Ахмэт усьмяхнуўся задаволены. Не,кажа, змарыўся я правіць стараной, а таму, што я бязьдзетны,ты,Алі, будзеш маім заступнікам.

— Воля твая! — адказаў Алі прытачыўшы пару цытат з карану,— але мо’ народ ня згодзіцца, нешта ён неспакойны, Паша. Кажа народ, што ты выгнаў з палацу падарожнага не накарміўшы, другога абгаварыў несправядліва, ды быццам веру прадзедаўскую хочаш замяніць на іншую і запрадаць усіх у ясыр...

Ахмэт хахатаў аж чуб яго трося, быццам апалены на сонцы банчук.

— — — — — — —

Было вялікае сьвята, калі ўсе прававерныя зыйшліся на нараду: як жыць далей? Паша Ахмэт гаварыў прамову.

— ...Што сонца ўсходзіла на ўсходзе, і заходзе на захадзе — гэта мая заслуга, выпрасіў я ў Аллаха — гаварыў Ахмэт.

А народ слухаў мудрай прамовы і хваліў Пашу: — важны Паша чалавек, хай яму будзе лёгкая ўсякая сьмерць. І баючыся за пашава здароў’е і каб не падарваўся ад дабрадзействаў, якімі асыпаў прававерных і меў намер яшчэ асыпаць—калі ня сам, дык праз свайго заступніка Алі, — народ выбраў другога Пашу.

Засумавалі ў гарэме адаліскі.

Раз была ціхая ноч. Месяц вісеў зачапіўшыся за хмарку над Басфорам. Сядзіць на беразе Ахмэт. Варожа яму з зораў хітры варажбіт.

— Ня можа тваё сэрца, Паша, пагадзіцца, што цябе, адзінага мудраца, не ацаніў народ па заслугах.


— Мала я іх рэзаў...—дадаў Паша Ахмэт.

— Аллах вялікі і ў адным нават найразумнейшым чалавеку ня зьмесьціцца — цягнуў хітры мудрэц, — забі тысячу людзей—у тысячу раз будзе і Аллах меншым...

Нехта галасіў у асірацеўшым гарэме ды на Басфоры кракталі жабы...

Т.

Урад і Рэвізыйная Камісія Беларускага Студэнцкага Саюзу ў Вільні.



Сядзяць зьлева на права: У. Клім, В. Жукоўская, А. Дасюкевіч (старшыня ўраду), Трафімучанка, М. Канцэлярчык. Стаяць: А. Засім, Г. Сухая і Я. Каліцкі.

Student i narod

Pačnu taniec, jak kažuć, ad piečy. Napradvieśni „Šlach Moładzi" i „Беларускі Летапіс" zaklikali biełaruskaje hramadzianstva da zboraŭ pomačy biełaruskamu studenctvu i vučnioŭskaj moładzi. Choć hetaja sprava ŭ nikatorym sensie dalikatnaja, bo tyčycca kankretnaj dla nas dapamohi z boku narodu, adnak nia budziem ubiracca ŭ šaty skromnaści, — razhledzim reč prosta i adkryta.

Pomač takaja patrebnaja. Viadoma, jak ciažka prychodzicca zdabyvać vyšejšuju aśvietu niekatorym studentam. Stałaje niedajadańnie, paŭtarajučyjasia vykreślivańni z liku studentaŭ za niaŭznos apłaty za navuku, usilenaje šukańnie lekcyjaŭ, ci inšaj zarabkovaj pracy, voś varunki, u jakich, budučy časam prosta biaz nijakaj dapamohi zdomu, biełaruski student ciarebić šlach da vyšejšaj navuki. Heta budni rečaistaści. A kolki jošć biełarusaŭ, akončyŭšych siarednija škoły, z maturaj u kišani, katoryja navat nie advažvajucca prykładać starańniaŭ dla pastupleńnia na universytet, viedajučy, što dla zdabyvańnia vyšejšaje aśviety ŭ kišani pavinna być aproč maturalnaha paśviedčańnia jašče štości inšaje. Adzinki zdolnyja i karysnyja dla narodu. Voźmiem, naprykład maładuju paetku Ninu Taras. Chacieła-b pastupić na ŭniversytet. I tolki žudasnyja mataryjalnyja varunki nie pazvalajuć. Niezamožnaść kasuje prava da vyšejšaje aśviety.

Na ŭsio biełaruskaje nasialeńnie ŭ Polščy majem žmieńku ŭ siarednich i vyšejšych škołach biełaruskaje moładzi Ci-ž biełaruskaje hramadzianstva nia moža stvaryć minimalna znosnyja varunki da navuki? Mahčymaść zusim realnaja. Adnak zakliki ŭ presie nie znajšli vodhałasu ŭ narodzie. Čamu? Heta važnaje dla nas pytańnie. Na pieraškodzie biednaść narodu? Nie: — pa hrošu, pa dva i ŭžo źbiarecca pavažnaja suma. Brak achviarnaści ŭ narodzie? Fakty kažuć — naš narod patrapić być achviarnym. Hałoŭnaja pryčyna takoha stanu lažyć u niepapularnaści biełaruskaha studenta siarod narodnych huščaŭ. Časta nas traktuje sielanin, jak pankoŭ. My słaba źviazany z narodam, mała pracujem u im, u toj čas, jak abstaviny kładuć na nas vielmi pavažnyja zadańni. Heta pavinna być dla nas hałoŭnaj lekcyjaj z vyšej skazanaha. Mała jošć na śviecie narodaŭ, jakija-b mieli tak niaznačnuju prasłojku intelihiencyi, jak biełarusy pa hety bok ryžskaje miažy Dyk nia dziva, što pierad biełaruskim studentam stajać značna bolšyja zadańni, čym pierad polskim, žydoŭskim, ci ukrainskim. Jaho ŭdzielnaja vaha ŭ narodzie pavinna być kudy bolšaja. Ci-ž takija vyvady my robim u štodziennaj praktycy? Daloka nie. Ab hetym śviedčyć choć-by małaja naša papularnaść u narodzie. Ci šmat my pamahajem starejšamu arhanizavanamu bieł. hramadzianstvu? Ci naležna vykarystyvajem našy vyjezdy z Vilni — leta, Kaladnija i Vialikodnija śviaty? Hetyja pytańni pavinien zadać sabie kožny biełaruski student, a adkazać achviarnaj praktykaj asabliva ciapier — padčas letnich kanikułaŭ.

Raźjaždžajemsia. Jedziem u narod. Pierad nami vysoŭvajecca rad zadač. Ale samaja hałaŭniejšaja — heta kulturna-praśvietnaja praca. Treba dobra zrazumieć kožnamu z nas, što ŭ hłušy ciemry, pry nizkim uzroŭni nacyjanalnaj śviedamaści narodnych mas biełaruskaja ahulna-nacyjanalnaja sprava nia pojdzie chutka ŭpierad; sa śviadomym i kulturnym narodam zaŭsiody bolš ličacca.

Kulturna-aśvietnaja praca, zrazumieła, pavinna vieścisia ŭ rodnaj movie, jak bolš dastupnaj dla narodnych mas. Kultura ŭ pieršuju čarhu biełaruskaja, a potym ahulna-ludzkaja, bo my sami biełarusy, dy heta naša pryrodnaje prava i abaviazak. Treba vykarystać usie formy i mahčymaści pracy na kulturnaj nivie.

Pavažnym uśviedamlajučym i arhanizujučym čynnikam musić być peryjadyčnaja presa. Svaju misiju jana vykanaje tolki tady, kali budzie dachodzić da samych šyrejšych narodnych huščaŭ. Voś-ža kožny student musić parupicca, kab znajšci dla časapisaŭ čym najbolš stałych padpiščykaŭ i kolporteraŭ. Musim pryvučyć moładź čytać presu hrupova, kab lepš raźbiracca i ŭsvojvać źmiest dy rabić vyvady dla dziejańnia z aktualnych artykułaŭ i zaciemak.

Prykładnaj kulturnaj rabotaj treba ŭkaranić siarod moładzi tradycyju chatniaha navučańnia.

Śvincoŭku i razboi treba zamianić choć prymityŭnym sportam. Praktyka nas vučyć, što kuplenaja na vioscy sietkaŭka, jak mahnitam, pryciahvaje da siabie ŭsiu moładź,—kudy! navat starejšych mužčyn.

Dzie mahčyma studenty pavinny być inicyjatarami i arhanizatarami biełaruskich spektaklaŭ, publičnych odčytaŭ z historyi Biełarusi, litaratury i inšych halin viedy. Niama dazvołu na publičny odčyt — pravodzim hrupavyja hutarki.

Moładź lubić deklamavać vieršy, hrupovuju śpieŭku, vystupać na scenie, nažal nie zaŭsiody ŭmieje. Choča navučycca. Vielmi dobra było-b, kab studenty pamahli, arhanizujučy niešta ŭ rodzie kursaŭ pa hetych pytańniach. Nia ŭdasca štości vialikaje — sarhanizujem mienšaje, a probavać treba.

Treba ŭ narodzie vyjavić kulturna-aśvietny aktyŭ, ludziej zdolnych i addanych hetaspravie, katoryja mahli-b pravodzić niadalej začatuju samaadukacyju, asabliva poznaj vosieńniu i zimoju, padčas doŭhich viečaroŭ, kalnas, studentaŭ, na vioscy nia budzie.

Kožny student pavinien być aficeram na kulturna-aśvietnym froncie. Nie adzin z nas nia zmoža vytłumačyć svaju biazdziejnaść via-

Biełaruskaja pieśnia ŭ vykanańni M. Zabejdy-Sumickaha.

Biełarus śpiavak, — artyst eŭrapejskaje sławy, tenar-solist Miłanskaj i Paznanskaj opery— šyroka viedamy i siarod biełaruskaha hramadzianstva.

Jaho kancerty — trojčy ŭ Vilni i ŭ Biełastoku, a tak-ža ŭ Varšavie i śpievy ŭ Radyjo — daloka raźnieśli sławu našaj biełaruskaj narodnaj miłahučnaj pieśni.



MICHAŁ ZABEJDA-SUMICKI

M. Zabejda-Sumicki svaim mastackim śpievam, ahułam kažučy, čaruje słuchačoŭ, a słuchača biełarusa vykanańniem biełaruskaj narodnaj pieśni prosta hipnotyzuje.

Słušna pisaŭ adzin z mnohich recenzentaŭ (niebiełarus i nie ŭ biełaruskaj presie) ab vykanańni M. Zabejda-Sumickim biełaruskaj pieśni, što chiba i sam jaje tvarec, biełaruski narod, dasiul nia viedaŭ ab krasie svajho tvoru.

I sapraŭdy, M. Zabejda-Sumicki adtvaryŭ poŭniu krasy našaj pieśni.

Tyja, što nia čuli pryhožstva biełaruskaj pieśni ŭ vykanańni Zabejdy-Sumickaha biespasredna, mohuć heta pačuć z hramafonnych plitaŭ firmy Odeon-His Master's Voice-Columbia, na jakich „zapisany" biełaruskija narodnyja pieśni z akampanijamentam arkiestry ŭ vykanańni našaha słaŭnaha śpievaka.

Naśpiavaŭ jon na hramafonnyja plity hetkija pieśni: plitka 271378: „Jak pamiorła matulka" i „Rabina"; pl. 271379: „Małady dubočak" i „Čamu mnie nia pieć"; pl. 271380: „Oj rana, rana kury zapieli" i „Lacić saroka"; pl. 271381: „Ščuka ryba ŭ mory" i „Koń biažyć ziamla dryžyć"; pl. 271382: „Lavonicha" (nac. taniec) i „A ŭ lesie lesie".

Za heta ŭsio češć i sława Michału Zabejdzie-Sumickamu — našamu biełaruskamu narodnamu śpievaku!

j.

---

likimi piaraškodami. Nia treba zakryvać vočy — z pieraškodami tut spatkajemsia dy nie z małymi, ale heta nie aznačaje, što ničoha nia možna rabić. Našyja zadačy — „to doŭh prad narodam, to doŭh razumieńnia, jakoje začerpali my". Kali doŭh urehulujem, narod inakš adniasiecca da nas. Kožny syn jaho z hordaściu skaža — heta našy studenty.

T. S.

Chronika

Z dziejnaści Biełaruskaha Studenckaha Sajuzu U.S.B. ad 1 stud. 1937 h. *17 stud.* Karystajučy z pryjezdu ŭ Vilniu viedamaj biełaruskaj paetki Natalli Arsieńnievaj, katoraja stała prabyvaje na čužynie, B.S.S. i T-va Pryjacielaŭ Biełarusaviedy pry U.S.B. zładzili aŭtarski viečar paetki. Referat ab litaraturnaj tvorčaści paetki pračytaŭ dr. St. Stankievič, a paśla sama paetka pračytała rad niedrukavanych jašče vieršaŭ, jakija sabranyja pryjmali hučnymi vopleskami. Na zakančeńnie biel. studenty padali paetcy pryhožy bukiet žyvych krasak.

30 stud. U pamieškańni B.S.S. stud. V. Papucevič pračytaŭ referat ab biełaruskaj dziejnaści Šafnagiela. Pa referacie adbyłasia dyskusija.

6 lutaha Bieł. Stud. Sajuz z Litoŭskim i Ukrainskim Stud. Sajuzamiładziŭ tradycyjnuju supolnuju viečarynu.

14 sakavika adbyŭsia ahulny hadavy spravazdaŭčy schod i pieravybary ŭładaŭ B.S.S. na nastupny hod. U skład novaha Uradu B.S.S. uvajšli: Adam Dasiukievič—staršynia, M. Kancelarčyk, V. Žukoŭskaja, U. Klim i A. Zasim—siabry Uradu. U skład Revizyjnaj Kamisii vybrali: T. Trafimavičanku, H. Suchuju i J. Kalickaha.

3 krasavika V. Skłuboŭski čytaŭ referat na temu: „Mataryjalistyčny i idealistyčny śvietapahlad". Pa referacie była dyskusija.

17 krasavika adbyŭsia dyskusyjny viečar nad vydavanym V. Papucevičam časapisam p. n. „25 Сакавіка".

5 traŭnia była sarhanizavana tavaryskaja viečaryna „Čyrvonaje Jaječka". Impreza heta nasiła ŭnutrany charaktar i adbyłasia vyklučna ŭ prysutnaści siabroŭ B.S S.

16 traŭnia B. S. Sajuz zładziŭ kancert Michała Zabejdy-Sumickaha i Biełaruskaha Choru kiravanaha R. Šyrmaju. Kancert prajšoŭ duža ŭdała. Ahramadnaja sala Śniadeckich na U.S.B. była pierapoŭniena prysutnymi. Kancert — heta adzinaja najpavažniejšaja impreza ŭ dziejnaści B. S. S.

27 traŭnia B.S.S. ładziŭ vybieh u Verki ŭ prysutnaści davoli vialikaj kolkaści siabroŭ B.S.S. i maturystaŭ Vil. Bieł. Himnazii.

— Vilenskija vajavodzkija administracyjnyja ŭłady piśmom z dnia 7-ha červienia paviadomili Biełaruski Studencki Sajuz, što siabrom jaho nie dazvalajecca nasić sajuznych šapak i bantaŭ (istužak).

Šapki i istužki mieli nacyjanalnyja biełaruskija kolery i siabry Sajuzu ŭžyvali ich užo niekalki hod.

Urad Bieł. Stud. Sajuzu pastanovu vajavodzkich uładaŭ zaskaržaje ŭ ministerstva. Treba adznačyć, što ŭ adnosinach da studentaŭ inšych nacyjanalnaściaŭ vajavodzkija ŭłady inačaj adnieślisia, imienna dazvolili im nasić ichnija arhanizacyjnyja adznaki.

Z dziejnaści T-va Pryjacielaŭ Biełarusaviedy pry U.S.B. u Vilni ad 1 stud. 1937 h.

7 sakavika ŭ VI zali haloŭnaha budynku U.S.B. ks. Adam Stankievič pračytaŭ referat na temu: „praf. M. Babroŭski, jaho žyćcio, dziejnaść i biełaruskaść“.

13 sakavika adbyŭsia ahulny hadavy schod i pieravybary Ŭładaŭ T-va. U skład novaha Uradu ŭvajšli: Antoś Šukiełajć — staršynia, A. Katkavičanka, V. Žukoŭskaja, St. Naruševič i M. Smarščok — siabry Ŭradu.

11 krasavika ŭ VI zali haloŭnaha budynku U.S.B. dr. Janka Stankievič pračytaŭ referat na temu: „Niekatoryja mamenty ŭ historyi Biełarusi“.

18 krasavika T-va arhanizavała ekskursiju ŭ Biełaruski Muzej im. Ivana Łuckieviča, *21 krasavika* ŭ Archeolohičny Muzej U.S.B. i Muzej Ikonografii pry Biblijatecy im. Wrubleŭskich, a 25 kras. u Pryrodaviedny Muzej U.S.B.

9 traŭnia ŭ zali Instytutu Klasyčnaje Archeolohii U.S.B. inž. L. Dubiejkaŭski pračytaŭ referat na temu: „Reforma dzieravianaha budaŭnictva“.

30 traŭnia T-va ładziła ŭračysty referat pryśviečany 20-tym uhodkam śmierci M. Bahdanoviča. Referat čytaŭ A. Łuckievič, a Fr. Alachnovič i H. Suchaja prarecytavali cely rad tvoraŭ paety.

Z. Z.

Праца над чысьцінёй беларускага языка.

Язык ёсьць вытварам апрычонай псыхікі народу, а тым самым ён найдаражэйшы скарб народны. Ёсьць родны язык адначасна відавочным і найлепшым вязьмом, злучаючым усіх сяброў данага народу. Страта роднага языка найчасьцей вядзе да сьмерці й сам народ. Дзеля таго такі дарагі кожнаму народу яго язык. Жыды, што забыліся свой язык болей як дзьве тысячы год назад, ускрашаюць цяпер яго, вучацца з кніжак. Падобна робяць Ірляндцы, каторых толькі невялічкая часьць захавала сваю родную мову. Іншыя народы не патрабуюць такога героізму, каб захаваць родны язык. Але, як кожны скарб, родная мова, язык вымагае пашаны і ўважных да сябе адносінаў. Дык зразумела, чаму ўсе сьвядомыя й сьветлыя народы ня толькі пазнаюць навукова свой язык, але й працуюць дзеля практычных яго патрэбаў, рупяцца забясьпечыць яго адпаведнымі тэрмінамі на новыя поймы, усьцерагчы яго ад скрыўленьня чужымі ўплывамі і інш. Арганізаваны дзеля гэтага адумысловыя таварыствы, установы, выдаюцца пасьвячоныя практычным патрэбам мовы часапісы. Гэта робяць народы, языку каторых нічога не пагражае, як прыкладам Немцы, Французы, а із Славянаў асабліва рупяцца аб роднай мове Чэхі й Палякі. Дык і пагатове павінны рупіцца аб чысьціні свае мовы мы Беларусы, бо наш язык перажывае цяперака вельмі адказную й небясьпечную пару ў сваёй гісторыі. Яму пагражаюць чужыя ўплывы, тым небясьпячнейшыя, што напіраюць, як на мову нашае інтэлігенцыі, так і на мову простага народу. Калі не бараніцца, дык гэтыя ўплывы запсуюць нашую мову, скалечаць яе, а нат і зусім зьністожаць. Тут асабліва патрэбна навуковая праца з адначасным практычным выкарыстаньнем даных навукі.

К. Л—Іч.

Siabrom Bieł. Stud. Sajuzu, Marysi Chinievičancy i Viktaru Vojtanku, z pryčyny Ich žanimstva, ščyryja pažadańni składaje

Urad Bieł. Stud. Sajuzu.

Vilnia, 20.VI.37.

Padziaka

Pavažanamu Hramadzianinu Advakatu Paŭłu Śvirydu za hrašovuju dapamohu składaje ščyruju padziaku

Urad Bieł. Stud. Sajuzu.

Vilnia, 20.VI.37.

Выдавец: В. Ярмалковіч. Беларуская Друкарня ім. Фр. Скарыны ў Вільні.